

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №5 (21)
Студзень 2022

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **2022 год аб’яўлены Годам гістарычнай памяці** | **Стар. 1** |
| **У Беларусі аб’явілі птушку 2022 года. 10 фактаў пра яе.** | **Стар. 2** |
| **Рэспубліканскі рэферэндум – 2022** | **Стар. 3** |
| **Калі хочаш быць здаровым** | **Стар. 4** |
| **Раённы этап 17-й Алімпіяды па правілах дарожнага руху** | **Стар. 5** |
| **ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна** | **Стар. 6** |

# 2022 год аб’яўлены Годам гістарычнай памяці



# У Беларусі аб’явілі птушку 2022 года. 10 фактаў пра яе.



Птушкай 2022 года выбрана патрыётка Палесся, паляшучка - **белая сініца** (рус. – белая лазоревка) – невялікая прыгожая пеўчая птушка, якая жыве ў нас толькі на Палессі. Менавіта за яе кандыдатуру прагаласавалі сябры ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”. Яна змяніла леляка – птушку 2021 года.

**Што ж гэта за птушка? 10 фактаў пра яе.**



1. Белая сініца мае яшчэ адну назву – **князёк**, сапраўдны князёк сярод сініц! Гэта адзін з сямі відаў сініцавых у Беларусі.

2. Від уключаны ў Чырвоную кнігу Беларусі яшчэ з першага выдання. Колькасць у Беларусі апошні раз ацэньвалася ў 2015 годзе ўсяго ў 500-800 пар.

3. Птушка меншая за вераб’ёў: вага да 16 г, размах крылаў да 21 см. У кладцы да 11 яек. Два тыдні птушкі іх наседжваюць і столькі ж выкормліваюць птушанят.

4. Гняздуе ў Беларусі і Украіне толькі ў Палессі і нават узімку не пакідае яго. Птушкі канцэнтруюцца вакол Прыпяці і на яе прытоках. Тут белая сініца ўтварае ізаляваную папуляцыю. Асноўны ж арэал расцягнуўся паласой ад Масквы да Японскага мора.

5. Для гнездавання птушцы патрэбны дубровы, чорнаалешнікі і старыя вербалозы, якія ўвесну залівающца вадой падчас паводкі. Таму менавіта вакол Прыпяці птушкі і жывуць і нідзе болей на захад, поўнач ці поўдзень.

6. Пры ўтварэнні пары самец робіць адмысловы рытуал – корміць самачку.

7. У красавіку, калі ў белай сініцы пачынаецца гнездавы сезон, яе лёгка заўважыць: самец вельмі актыўна спявае на сваім участку. А вось падчас выкормлівання птушанят белыя сініцы паводзяцца як партызаны - хаваюцца.

8. Гняздо робіць, як і іншыя сініцавыя, у дупле, вядомыя выпадкі гнездавання ў шчылінах дамоў. Не цураецца людзей і часта селіцца ў населеных пунктах. З задавальненнем займае сінічнікі – штучныя дуплянкі. Гнёзды часта робіць нізка, часам усяго на паўметра ад зямлі!

9. Узімку яе можна пабачыць у густых зарасніках трыснягу па поймах рэк. Яна расшчапляе моцнай дзюбай цвёрдыя сцёблы трыснягу і парасонавых раслін, адшукваючы схаваных там лічынак казурак. Узімку можа есці і насенне.

10. Белая сініца - адзін з самых папулярных відаў беларускіх птушак за мяжой, шмат турыстаў прыязджае да нас на Палессе, каб пабачыць менавіта яе.

# Рэспубліканскі рэферэндум – 2022




18 студзеня з педагагічным калектывам школы сустрэўся старшыня Фаніпальскага сельскага выканаўчага камітэта Лобач Уладзімір Іосіфавіч. Сустрэча адбылася ў рамках усенароднага абмеркавання праекта змен і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.



Лобач У.І. азнаёміў прысутных з асноўнымі змяненнямі і дапаўненнямі, што прапануюцца ў праекце Канстытуцыі, нагадаў аб магчымасці ўнясення змяненняў і дапаўненняў у абмяркоўваемы праект, аб важнасці ўдзелу кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у маючым адбыцца рэферэндуме.

Прысутныя на сустрэчы прыйшлі да адзінай думкі аб тым, як важна захаваць духоўныя і культурныя традыцыі беларускага народа, яго гістарычную памяць. Таксама была адзначана неабходнасць прадаўжэння развіцця сацыяльна арыентаванага вектара развіцця нашай дзяржавы.





# Калі хочаш быць здаровым




21 студзеня ў рамках тэматычнага тыдня "Здаровае харчаванне - здаровае дзіця" ў 5 класе прайшла класная гадзіна на тэму "Калі хочаш быць здаровым".

У ходзе інтэрактыўнай гутаркі вучні ўспомнілі правілы здаровага харчавання, абмеркавалі, якія прадукты павінны быць у прадуктовай карзіне, і ад якіх лепш адмовіцца, пазнаёміліся з асноўнымі групамі вітамінаў і запомнілі, у якіх прадуктах змяшчаецца больш за ўсё вітамінаў і карысных для нашага арганізма рэчываў.

Вынікам мерапрыемства стала лесвіца здароўя, складзеная вучнямі. Ступенямі для лесвіцы паслужылі парады па правільным харчаванні і здароваму ладу жыцця.

Дамоў вучні панеслі памяткі "Правільнае харчаванне - залог здароўя", каб яшчэ раз абмеркаваць тэму здаровага харчавання са сваімі бацькамі.










## Памятайце:
## правільнае харчаванне – аснова здароўя!

# Раённы этап 17-й Алімпіяды па правілах дарожнага руху




22 студзеня на базе дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа №4 г.Дзяржынска" адбыўся раённы этап 17-й Алімпіяды па Правілах дарожнага руху.

Мэта і задачы мерапрыемства - прапаганда ведаў Правілаў дарожнага руху сярод навучэнцаў, прывіццё дзецям навыкаў бяспечных паводзін на вуліцах і дарогах, удасканаленне форм і метадаў работы па папярэджанні дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму.

У дадзеным мерапрыемстве нашу школу прадстаўлялі наступныя вучні: Яўсеенка Захар (7 клас), Крэмянеўскі Дзяніс (6 клас), Гурло Вячаслаў (5 клас).

Алімпіяда праходзіла ў тры этапы.
Этап 1. Творчы конкурс - відэаролік на тэму "Я выконваю Правілы дарожнага руху!"
Этап 3. Каманднае рашэнне задачы "Дарожная сітуацыя
Этап 2. Індывідуальнае рашэнне білетаў па ПДР.

Усім удзельнікам алімпіяды былі ўручаны памятныя сувеніры (флікеры).










## Выконвайце правілы дарожнага руху!

# ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна

28 студзеня ў рамках рэалізацыі адукацыйнага праекта "ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна" для вучняў 5-6 класаў была праведзена інтэрактыўная класная гадзіна "Я - пра закон, закон - пра мяне".

У фокусе абмеркавання былі наступныя паняцці: прававая культура, павага да закону, правапарадку, маральна-прававым нормам; правы, абавязкі і адказнасць непаўналетніх згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь; "свавольства", "правіны", "злачынства", "правапарушэнне", уяўленне аб наступствах супрацьпраўных дзеянняў, пачуццё адказнасці за свае ўчынкі.

Вучні абмяркоўвалі праблемныя сітуацыі і знаходзілі шляхі іх вырашэння, зразумелі, якім чынам свавольства можа стаць правапарушэннем, пазнаёміліся з дзіцячым прававым сайтам.












Рэдкалегія: вучні 5 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 5 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 28 лютага.